# ТЭСТ

# 1. Да накірункаў бібліяграфічнай дзейнасці адносяцца:

1. фарміраванне даведачна-бібліяграфічнага апарата бібліятэкі
2. фарміраванне фонду бібліятэкі
3. падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў
4. абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк
5. фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі

# 2. Да цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці адносяцца:

1. кніжныя палаты
2. бібліятэкі
3. цэнтры навукова-тэхнічнай інфармацыі
4. клубныя установы
5. выдавецтвы

# 3. Да бібліяграфічных прадуктаў адносяцца:

1. каталогі
2. картатэкі
3. дні бібліяграфіі
4. вусныя бібліяграфічныя агляды
5. бібліяграфічныя дапаможнікі

# 4. Да бібліяграфічных паслуг адносяцца:

1. каталогі
2. картатэкі
3. дні бібліяграфіі
4. вусныя бібліяграфічныя агляды
5. бібліяграфічныя дапаможнікі

# 5. Цэнтрам бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі ў Беларусі з’яўляецца:

1. Нацыянальная бібліятэка Беларусі
2. Беларускі інстытут сістэмнага аналізу
3. Нацыянальная кніжная палата
4. Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі
5. Прэзідэнцкая бібліятэка

# 6. Асноўныя бібліяграфічныя функцыі Нацыянальнай кніжнай палаты:

1. дзяржаўны бібліяграфічны ўлік усёй друкаванай прадукцыі краіны
2. падрыхтоўка і выпуск крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі
3. падрыхтоўка і выпуск крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі
4. абслугоўванне карыстальнікаў інфармацыі
5. падрыхтоўка зборнікаў афіцыйных дакументаў

# 7. Асноўныя функцыі выдавецтваў як бібліяграфічных цэнтраў:

1. падрыхтоўка тэматычных планаў выпуска літаратуры
2. абслугоўванне карыстальнікаў інфармацыі
3. фарміраванне фондаў выдавецтваў
4. падрыхтоўка каталогаў выдавецтваў
5. выпуск рэкламна-бібліяграфічных матэрыялаў

# 8. Асноўныя функцыі кніжных магазінаў як бібліяграфічных цэнтраў:

1. даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў
2. бібліяграфічнае інфармаванне пакупнікоў
3. вядзенне картатэк, баз даных
4. падрыхтоўка і вядзенне каталогаў
5. стварэнне крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі

# 9. Асноўныя функцыі бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў:

1. падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў
2. фарміраванне бібліяграфічнай культуры чытачоў
3. падрыхтоўка каталогаў бібліятэк
4. бібліяграфічнае абслугоўванне чытачоў
5. улік чытачоў бібліятэк

# 10. Які бібліяграфічны цэнтр у Беларусі выпускае “Летапіс друку Беларусі”:

1. Нацыянальная бібліятэка Беларусі
2. Беларускі інстытут сістэмнага аналізу
3. Нацыянальная кніжная палата
4. Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі
5. Прэзідэнцкая бібліятэка

# 11. Неабходнымі ўмовамі ўзаемадзеяння бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў з’яўляюцца:

1. наяўнасць адзінага каардынацыйнага цэнтра ўзаемадзеяння
2. наяўнасць нарматыўных дакументаў аб ўзаемадзеянні
3. спецыялізацыя ў дзейнасці бібліятэк
4. наяўнасць матэрыяльна-тэхнічнай базы
5. наяўнасць эканамічных рэсурсаў

# 12. Асноўныя напрамкі ўзаемадзеяння бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў:

1. карпаратыўная каталагізацыя
2. кааперацыя работы па падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў і БД
3. стварэнне зводных каталогаў  бібліятэк
4. фарміраванне адзінага бібліятэчнага фонда краіны
5. арганізацыя выставачнай работы

## Тэма 2.

# АРГАНІЗАЦЫЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

# Пытанні:

1. Агульныя пытанні бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі
2. Асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў
3. Бібліяграфічнае падраздзяленне бібліятэкі і яго асноўныя функцыі
4. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі

# 1. Агульныя пытанні бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі

# Агульныя пытанні

- Бібліяграфічная дзейнасць ажыццяўляецца ў бібліятэках усіх тыпаў і ўсіх узроўняў
- Асноўныя напрамкі бібіляграфічнай дзейнасці – гэта змест работы, але важкім пытаннем з'яўляецца арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці
- **Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці – гэта комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне паспяховага выканання бібліятэкай сваіх задач з выкарыстаннем усяго арсенала бібліяграфічных сродкаў**

# Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці: змест паняцця

- планаванне ўсіх відаў працэсаў і аперацый
- вызначэнне арганізацыйных структур, якія будуць выконваць бібліяграфічныя функцыі, г.зн. фарміраванне бібліяграфічнай службы бібліятэкі
- размеркаванне абавязкаў паміж бібліёграфамі
- улік і аналіз, справаздача аб выкананні бібліяграфічнай работы
- каардынацыя і каапераванне бібліяграфічнай дзейнасці
- выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій і найноўшых тэхнічных сродкаў
- павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў

Бібліяграфічная служба – падсістэма бібліятэкі, якая забяспечвае яе бібліяграфічную дзейнасць

# У склад бібліяграфічнай службы ўваходзяць:

- арганізацыйныя формы бібліяграфічнай дзейнасці;
- персанал або суб’екты бібліяграфічнай дзейнасці;
- інфармацыйныя рэсурсы, прадстаўленыя бібліяграфічнымі і даведачнымі крыніцамі розных відаў і месцаў захоўвання;
- матэрыяльна-тэхнічная база (МТБ) і эканамічная.

# Прынцыпы арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі:

- накіраванасць на рашэнне прыярытэтных у дадзеных умовах задач, якія стаяць перад бібліятэкай;
- даступнасць бібліяграфічнага абслугоўвання для ўсіх груп карыстальнікаў бібліятэкі;
- рацыянальнае спалучэнне цэнтралізацыі і дэцэнтралізацыі ў арганізацыі бібліяграфічнай службы бібліятэкі;
- навуковая абгрунтаванасць;
- бесперапыннасць удасканалення;
- планавасць;
- эканамічнасць.

# Патрабаванні да арганізацыі:

- дэмакратызацыя кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю;
- навукова абгрунтаванае планаванне і дакладны, поўны ўлік ўсіх кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці;
- рацыянальнае размеркаванне функцый паміж падраздзяленнямі бібліятэкі, якія вядуць бібліяграфічную работу;
- навукова абгрунтаваны падбор, расстаноўка кадраў, пастаяннае павышэнне іх бібліяграфічнай кваліфікацыі;
- рацыянальная тэхналагічная пабудова бібліяграфічных працэсаў, іх нарміраванне, укараненне новых прагрэсіўных тэхналогій, метадаў працы, інавацыйнага вопыту;
- развіццё разнастайных арганізацыйных формаў супрацоўніцтва з бібліятэкамі, інфармацыйнымі цэнтрамі і іншымі суб'ектамі сістэмы дакументных камунікацый.

# Асноўныя задачы бібліяграфічнай службы:

- стварэнне аптымальных умоў і роўных магчымасцей для поўнага задавальнення прафесійных і агульнакультурных патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі;
- усебаковая інтэнсіфікацыя бібліяграфічных працэсаў, укараненне новых інфармацыйных тэхналогій, рацыянальнае выкарыстанне з улікам аптымальнага ўзаемадзеяння аўтаматызаваных і традыцыйных сродкаў падрыхтоўкі і давядзення інфармацыі да спажыўцоў;
- павышэнне эфектыўнасці і якасці бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, ствараемых бібліяграфічнымі службамі; гарантаванне дыферэнцыраванасці, паўнаты, дакладнасці і аператыўнасці бібліяграфавання і абслугоўвання;

# Асноўныя задачы бібліяграфічнай службы:

- павышэнне камфортнасці абслугоўвання спажыўцоў за кошт комплекснага прадастаўлення бібліяграфічнай інфармацыі і першаснага дакумента;
- вызначэнне свайго месца на інфармацыйным рынку рэгіёна, распрацоўка асартыменту бібліяграфічных прадуктаў і паслуг у адпаведнасці з інфармацыйнымі патрэбамі спажыўцоў інфармацыі і магчымасцямі бібліятэк;
- укараненне элементаў эканамічнага гаспадарання ў практыку работы бібліятэк, пераарыентацыя бібліяграфічных напрамкаў дзейнасці на канчатковыя вынікі працы.

# 2. Асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў

# Фактары, якія ўплываюць на структуру бібліяграфічнай службы

**Знешнія:**

- статус
- тып бібліятэкі і яе галоўныя задачы
- ведамасная прыналежнасць
- склад карыстальнікаў
- відавы склад і аб'ём фондаў
- месца ў інфармацыйнай структуры рэгіёна

**Унутраныя:**

- колькасць падраздзяленняў бібліятэкі
- іх тэрытарыяльнае размяшчэнне
- колькасць штатных супрацоўнікаў, узровень іх прафесійнай падрыхтоўкі
- ступень выкарыстання сродкаў аўтаматызацыі

# Адметнасці бібліяграфічных служб бібліятэк розных тыпаў

- залежнасць ад статуса бібліятэкі
- залежнасць ад арганізацыйнай структуры бібліятэкі
- самастойнасць бібліятэк у вызначэнні арганізацыйнай структуры бібліятэкі і адпаведна структуры бібліяграфічнай службы
- дэцэнтралізаваны характар бібліяграфічнай службы бібліятэк РБ

# Бібліяграфічная служба

- цэнтралізаваная бібліяграфічная служба прадугледжвае сканцэнтраванасць бібліёграфаў і выкананне ўсіх бібліяграфічных функцый у бібліяграфічным аддзеле
- дэцэнтралізаваная бібліяграфічная служба – штатныя бібліёграфы працуюць не толькі ў бібліяграфічным, але і ў іншых аддзелах бібліятэкі (функцыянальных, галіновых, комплексных і інш.)

# Цэнтралізаваная бібліяграфічная служба дазваляе:

- забяспечыць адзінства бібліяграфічнага абслугоўвання і даведачна-бібліяграфічнага апарату (ДБА);
- захаваць бібліяграфічны аддзел як асноўнае звяно ў сістэме бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі;
- аператыўна вырашаць арганізацыйныя праблемы;
- рацыянальна размяркоўваць абавязкі паміж усімі бібліёграфамі;
- выключаць дубліраванне;
- укараняць новыя прагрэсіўныя тэхналогіі, інавацыйныя формы і метады бібліяграфічнай работы;
- уніфікаваць асобныя бібліяграфічныя працэсы;
- ствараць перадумовы для эфектыўнага міжведамаснага ўзаемадзеяння бібліятэкі з іншымі бібліятэкамі, органамі інфармацыі.

# Дэцэнтралізаваная бібліяграфічная служба:

- бібліёграфы спецыялізуюцца на рабоце з пэўнай літаратурай і могуць больш якасна праводзіць бібліяграфаванне дакументаў, бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў

Але:

- шматкратнае дубліраванне працэсаў і аперацый;
- раздробленасць ДБА бібліятэкі;
- нізкая тэхналагічная дысцыпліна;
- большую частку рабочага часу бібліёграфы галіновых аддзелаў заняты бібліятэчным абслугоўваннем чытачоў;
- маюцца цяжкасці ў абмене вопытам, прафесійных зносінах бібліёграфаў і інш.

# Пытанне студэнтам:

**Чаму ў бібліятэках краіны дэцэнтралізаваная бібліяграфічная служба ?**

# Прычыны:

- бібліяграфічныя працэсы інтэграваны з бібліятэчнымі, з’яўляюцца часткай комплекснага бібліятэчнага працэса
- бібліяграфічныя рэсурсы выступаюць як сродкі дзейнасці ўсіх падраздзяленняў бібліятэкі
- Існаванне галіновых, комплексных аддзелах звязана з вырашэннем задачы комплекснага задавальнення ІП карыстальнікаў (як першаснымі дакументамі, так і бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыяй)
- тэрытарыяльная раздробленасць будынкаў бібліятэкі

# Арганізацыйныя меры:

- дакладнае размеркаванне бібліяграфічных функцый як паміж аддзеламі, так і ўнутры іх з абавязковым іх замацаваннем у нарматыўных дакументах;
- наданне бібліяграфічнаму аддзелу функцый арганізатара і каардынатара бібліяграфічнай дзейнасці, што заключаецца ў зводным планаванні бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі, распрацоўцы адзіных формаў уліку бібліяграфічнай работы, арганізацыі ўзаемадзеяння пры выкананні пэўных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці, кансультацыйна-метадычнай дапамогі бібліёграфам небібліяграфічных падраздзяленняў;
- стварэнне адзінага універсальнага ДБА бібліятэкі, у фарміраванні якога прымаюць удзел усе штатныя бібліёграфы.

# Бібліяграфічная служба ЦБС

- бібліяграфічная служба цэнтральнай бібліятэкі;
- бібліятэкі-філіялы, у якіх бібліяграфічныя працэсы выконваюць бібліятэкары.

# Асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў ЦБС

- цэнтралізаванае выкананне асобных бібліяграфічных працэсаў з боку ЦБ;
- выкарыстанне уніфікаванай нарматыўнай і тэхналагічнай дакументацыі на бібліяграфічныя працэсы ва ўсіх структурных падраздзяленнях ЦБС;
- устойлівыя вытворчыя сувязі паміж цэнтральнай бібліятэкай і бібліятэкамі-філіяламі, што дазваляе ім выкарыстоўваць аб’яднаны інфармацыйны і інтэлектуальны бібліяграфічны патэнцыял ЦБС.

# 3. Бібліяграфічнае падраздзяленне бібліятэкі і яго асноўныя функцыі

# Нацыянальная бібліятэка Беларусі: бібліяграфічныя падраздзяленні

- Аддзел даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання (сектар даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, сектар інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання)
- Навукова-даследчы аддзел бібліяграфіі (сектар рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі, сектар фарміравання інфармацыйнай прадукцыі)
- Аддзел бібліяграфічнай апрацоўкі дакументаў (6 сектароў)
- Аддзел індэксіравання дакументаў (4 сектара)
- Аддзел вядзення нацыянальнай БД аўтарытэтных запісаў (2 сектара)
- Інфармацыйна-аналітычны аддзел (2 сектара)
- Аддзел карпаратыўнага ўзаемадзеяння

# Рэгламентуючыя дакументы

- “Палажэнне аб бібліяграфічным аддзеле”;
- палажэнні аб розных кірунках бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы;
- тэхналагічныя карты і інструкцыі на асобныя бібліяграфічныя працэсы;
- службовыя інструкцыі, у якіх акрэсліваюцца асноўныя абавязкі кожнага супрацоўніка і замацоўваецца размеркаванне абавязкаў паміж бібліёграфамі ў аддзеле.

# Пасады

- бібліёграф
- бібліёграф першай катэгорыі
- бібліёграф другой катэгорыі
- вядучы бібліёграф
- галоўны бібліёграф

# Спецыялізацыя бібліёграфаў

- функцыянальная
- змястоўная
- кваліфікацыйная

# Загадчык бібліяграфічнага аддзела

- плануе і арганізуе работу аддзела
- кантралюе выкананне планаў
- трымае справаздачу перад дырэктарам
- падбірае кадры і прадстаўляе іх на зацвярджэнне дырэктару
- адказвае за каардынацыю бібліяграфічнай работы як унутры бібліятэкі, так і за яе межамі з бібліятэкамі іншых сістэм і ведамстваў
- займаецца вывучэннем, абагульненнем і распаўсюджваннем інавацый у бібліяграфічнай дзейнасці, пытаннямі павышэння кваліфікацыі работнікаў аддзела і падраздзяленняў бібліятэкі
- можа выконваць асобныя віды работ як бібліёграф-прафесіянал

# Функцыі бібліяграфічнага падраздзялення:

- Функцыі = асноўныя кірункі бібліяграфічнай дзейнасці !!!
- Пералік (колькасць) выконваемых функцый, масштаб, змест залежаць ад тыпа бібліятэкі, яе задач, месца ў бібліятэчнай (інфармацыйнай) сетцы краіны (можна параўнаць рэспубліканскую бібліятэку і нізавую; універсальную і спецыялізаваную)

# 4. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі

# Аддзел камплектавання

- ствараюцца і выкарыстоўваюцца бібліяграфічныя сродкі бягучага камплектавання і дакамплектавання фонду бібліятэкі
- вядуцца картатэкі папярэдняга заказу, картатэка дакамплектавання фонду або база даных заказанай літаратуры
- супрацоўнікі аддзела ўдзельнічаюць у фарміраванні даведачна-бібліяграфічнага фонду бібліятэкі, у даведачна-бібліяграфічнай рабоце бібліятэкі, выконваючы запыты спажыўцоў аб паступленнях у фонд бібліятэкі дакументаў, іх месцазнаходжанні, удакладняюць бібліяграфічныя звесткі аб дакументах.

# Аддзел апрацоўкі дакументаў і арганізацыі каталогаў

- аналітыка-сінтэтычная апрацоўка паступаючых дакументаў, вынікам якой з'яўляюцца БЗ у традыцыйным выглядзе (карткі для каталогаў) ці электронным (БД, ЭК)
- арганізацыя і вядзенне каталогаў на фонд бібліятэкі як у традыцыйнай, так і электроннай формах
- рэдагаванне каталогаў і БД
- даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў пад час дзяжурства ў каталогах

# Аддзел краязнаўчай літаратуры

- арганізацыя і вядзенне краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату;
- падрыхтоўка і выданне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і паказальнікаў мясцовых дакументаў;
- выкананне вусных і пісьмовых разавых запытаў спажыўцоў па пытаннях краязнаўства;
- сістэматычнае бібліяграфічнае інфармаванне аб краязнаўчых дакументах арганізацый, спажыўцоў праз арганізацыю выстаў, падрыхтоўку аглядаў, выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі;
- распаўсюджванне краязнаўчых, у тым ліку і бібліяграфічных, ведаў;
- аказанне метадычнай і практычнай дапамогі бібліятэкам вобласці ў арганізацыі краязнаўчай работы.

# Галіновыя аддзелы

- арганізуюць і вядуць галіновую частку ДБА
- ажыццяўляюць даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне
- ажыццяўляюць бібліяграфічнае інфармаванне спецыялістаў адпаведнага профілю
- ствараюць бягучыя і рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі
- прымаюць ўдзел у бібліяграфічным навучанні чытачоў

# Чытальныя залы, абанемент

- даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне (як правіла, простыя запыты, якія не патрабуюць доўгага часу на пошук)
- работа па пашырэнні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі
- удзел у вядзенні лакальных частак ДБА на свой фонд

# Аддзел фондасховішча

- вядзенне неабходных каталогаў (тапаграфічны), картатэк, індыкатараў або БД, якія дазваляюць мець інфармацыю аб наяўнасці ці выдачы з фонду дакументаў, выконваць адрасна-бібліяграфічныя даведкі, прымаюць удзел у бібліяграфічным інфармаванні

# Навукова-метадычныя аддзелы (аддзелы бібліятэказнаўства)

- аналізуюць і абагульняюць вопыт бібліяграфічнай работы бібліятэк
- распаўсюджваюць інавацыйны вопыт бібліяграфічнай работы
- прымаюць удзел у павышэнні бібліяграфічнай кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк
- Аказваюць кансультацыйна-метадычную падтрымку у выкананні бібліяграфічных функцый
- рыхтуюць методыка-бібліяграфічныя матэрыялы ў дапамогу рабоце бібліятэк
- праводзяць навуковыя даследаванні па пытаннях бібліятэчнай бібліяграфіі

Як правіла!!! Сумесна з бібліяграфічным аддзелам